УДК 633.14 : 631.84 : 631.811.98

І. С. МОЦЬ, А. А. ДУДУК, П. І. МАЗОЛЬ

УПЛЫЎ АЗОТНЫХ УГНАЕННЯЎ І КАМПАЗАНУ НА ЎРАДЖАЙНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ ЗБОЖЖА АЗІМАГА ЖЫТА

Для павышэння ўраджайнасці і якасці збожжа азімага жыта вырашальнае значэнне набываюць угнаенні. У прыватнасці, на дзярнова-падзолістых глебах пры недахопе арганічнага рэчыва і азоту і дастатковым забеспячэнні фосфарам і каліем асаблівая роля належыць азотным

Табліца 1. **Паляганне раслін азімага жыта ў залежнасці ад доз азотных угнаенняў і выкарыстання кампазану**

Варыянт доследу	Год			Сярэдняе
	1988	1989	1990	
1. N_{60} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі раслін (кантроль)	4,3	3,8	4,8	4,3
2. N_{60} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі + кампазан	5,0	4,9	5,0	5,0
3. N_{60} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі + N_{30} у фазе выхаду ў трубку	4,0	3,0	4,6	3,9
4. N_{60} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі + N_{30} у фазе выхаду ў трубку + кампазан	5,0	4,6	5,0	4,9
5. N_{90} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі	3,7	2,6	4,1	3,5
6. N_{90} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі + кампазан	5,0	4,5	5,0	4,8
7. N_{120} вясной у пачатку вегетацыі + кампазан	5,0	4,2	5,0	4,7
8. N_{60} у пачатку аднаўлення вегетацыі + N_{30} у фазе выхаду ў трубку + N_{30} у фазе каласавання + кампазан	5,0	4,7	5,0	4,9
9. N_{60} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі + N_{60} у фазе выхаду ў трубку + кампазан	5,0	4,7	5,0	4,9
10. N_{90} вясной у пачатку аднаўлення вегетацыі + N_{30} у фазе выхаду ў трубку + кампазан	5,0	4,4	5,0	4,8

угнаенням. Аднак некаторыя даследчыкі адзначаюць, што ўнясенне павышаных доз азоту ў адзін прыём у пачатку аднаўлення вегетацыі азімага жыта выклікае невытворчыя яго страты пры вымыванні, дэнітрыфікацыі, біялагічным паглынанні, а таксама абумоўлівае магутны вегетатыўны рост і паляганне раслін. У той жа час вызначана [3, 4], што дробнае ўнясенне павышаных доз азотных угнаенняў пры падкормцы з перанясеннем асноўнай часткі азоту на больш позні тэрмін (трубкаванне) значна паніжае паляганне раслін, аднак цалкам яго не выключае. Пазбегнуць палягання раслін азімага жыта магчыма пры выкарыстанні рэгулятараў росту, у прыватнасці кампазану.

Задачай нашых даследаванняў з'яўлялася вывучыць уплыў розных доз азотных угнаенняў і выкарыстання кампазану на ўраджайнасць і якасць збожжа азімага жыта сорту Пухаўчанка. Палявыя даследаванні праводзілі на працягу 1988—1990 гг. у калгасе імя Някрасава Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая супясчаная. Магутнасць ворнага слоя 22—24 см, колькасць гумусу (па Цюрыну) — 1,68—1,77%, рухомага P_2O_5 (па Кірсанаву) — 14,1—14,9, абменнага K_2O (па Маславай) — 12,7—13,4 мг/100 г глебы. Папярэднік азімага жыта — ячмень. Схема доследу прыведзена ў табл. 1—3. Доследы закладваліся ў чатырохразовай паўторнасці з агульнай плошчай дзялянкі 1600 і ўліковай 384 м^2. Размяшчэнне варыянтаў рэндамізаванае.

Азотныя ўгнаенні ўносіліся ў падкормку згодна са схемай доследу. Пры першай і другой падкормках выкарыстоўвалася аміячная салетра, а пры трэцяй — раствор мачавіны, г. зн. праводзілася пазакаранёвая падкормка. У пачатку і сярэдзіне трубкавання пасевы, згодна са схемай доследу, апрацоўваліся кампазанам з разліку 2 кг/га дзеючага рэчыва. Першая апрацоўка пасеваў кампазанам сумяшчалася з унясеннем фундазолу. У фазе каласавання пасевы апрацоўваліся супраць хвароб байлетонам з разліку 0,5 кг/га прэпарата. У варыянтах, дзе праводзілася трэцяя падкормка азотам, унясенне байлетону сумяшчалася з пазакаранёвай падкормкай мачавінай. Ураджай збіралі падзялянкава ў фазе поўнай спеласці зярнят прамым камбайнаваннем. Агратэхніка вырошчвання азімага жыта ў асноўным адпавядала біялагічным асаблівасцям яго раслін.

Гады правядзення даследаванняў значна адрозніваліся па метэаралагічных умовах. Для росту і развіцця раслін найлепшымі былі 1988 і 1990 г. У 1989 г. адзначалася менш спрыяльнае надвор'е. Павышаная